Іваніцкі В.

# АНДРЭЙ МЕЛЬНІКАЎ

У канцылярыі калгаса "Камсамолец" на відным месцы вісіць грамата. У прыгожай рамцы. За шклом. Грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Андрэю Іосіфавічу Мельнікаву за геройства і мужнасць, праяўленыя ў дні Вялікай Айчыннай вайны, звання Героя Савецкага Саюза. Рэдка хто не зверне на яе ўвагі. А зверне, і сэрца напоўніцца павагай да гэтага чалавека, чые заслугі перад Радзімай адзначаны такой высокай урадавай узнагародай.

Чым жа вызначыўся Андрэй Мельнікаў, ураджэнец вёскі Колбава, наш зямляк?

Весткі аб ім вельмі скупыя. Ні застаўшыеся ў жывых родзічы, ні знаёмыя не ведалі больш таго, аб чым гаварыла грамата. Прыйшлося звярнуцца ў Маскву. Адтуль прыйшла копія з наградного ліста, у якім коратка былі выкладзены яго баявыя подзвігі.

...Летам 1943 года Савецкая Армія граміла фашысцкія полчышчы па ўсяму фронту. Разбіўшы акупантаў пад Курскам, Арлом і Белгарадам, нашы войскі разгарнулі баі за Харкаў і 23 жніўня вызвалілі яго ад нямецкіх захопнікаў. Адначасова пачаліся аперацыі па вызваленню Данбаса. У выніку імклівага наступлення быў вызвален горад Сталіна і рад іншых буйных населеных пунктаў Украіны. У гэты час на подступах да Бахмача змагаўся з ворагам намеснік па палітчастцы камандзіра дывізіёна аднаго з артылерыйскіх палкоў капітан Андрэй Іосіфавіч Мельнікаў.

...Бой разгараўся з новай сілай. Немцы рабілі ўсё, каб утрымаць горад. Прадпрынімалі адну шалёную атаку за другой. Глуха ўздрыгвала зямля. Нават прывычнае вуха артылерыстаў ледзь разлічала залпы гармат, грохат выбухаў. Усё злілося ў адзін працяглы гул. Клубы чорнага дыму злавесна цягнуліся на Захад, закрываючы сабой спякотнае вераснёўскае сонца. Мельнікаў прыўзняўся. Непрыемна пасыпаўся за каўнер пясок, трашчала на зубах. Не давала спакою смага. Хоць бы кроплю вады! Раптам увагу камісара прыцягнулі зялёныя постаці, якія шырокай хваляй каціліся на пазіцыі дывізіёна. У наступіўшую кароткую цішыню ўварваўся рокат матораў. Нехта крыкнуў: "Танкі!". З-за гарызонту вынырнулі "месершміты". Нямецкая пяхота ішла ў атаку пры падтрымцы сваіх "тыграў" і авіяцыі. Капітан абвёў вачыма байцоў, і на твары кожнага з іх прачытаў непахісную рашучасць стаяць да канца.

...Мельнікаў дзейнічаў з батарэяй у складзе 4 гармат. Ён ва ўпор ужо растраляў да двух рот фашысцкай пяхоты. Падбіў два танкі і самаходную пушку. У разгары боя не заўважыў, як быў ранены. З нагі цякла кроў. Але пераадольваючы боль, Мельнікаў працягваў кіраваць боем. Яшчэ адзін "тыгр" стаў, як укапаны, ад трапнага выстралу

батарэйцаў Мельнікава. Чацвёрты ахутаўся чорным дымам і павярнуў назад.

Магутнае рускае "ўра" на нейкі момант вывела капітана з таго стану напружанасці, у якім ён знаходзіўся спачатку боя. Ён азірнуўся і сэрца радасна-радасна застукала ў грудзі – на штурм горада пайшлі савецкія байцы. У той жа дзень Бахмач быў вызвален.

Гэтыя вераснёўскія дні былі поўны смяртэльных стычак з ворагам. Не раз Мельнікаў глядзеў прама ў вочы смерці, але ні разу не адступіў, не спалохаўся. Яго спакой, упэўненасць у перамозе перадаваліся батарэйцам. Сваім бясстрашшам, мужнасцю і гераізмам ён натхняў байцоў, быў заўсёды там, дзе кіпеў гарачы бой.

У баі за вёску Шурша-Буратава Мельнікаў падпусціў праціўніка на 400 метраў і прамой наводкай знішчыў два сярэдніх танкі, самаходную гармату, тры аўтамашыны і больш роты гітлераўцаў.

Нямецкае камандаванне імкнулася спыніць наступленне савецкіх войск на водных рубяжах – на рацэ Дзясне і асабліва на Дняпры. За гэтыя рубяжы змагалася і батарэя капітана Мельнікава.

Шалёнае супраціўленне аказалі гітлераўцы на Дзясне. Невялікая вёска Рудня пераходзіла некалькі разоў з рук у рукі. Карыстаючыся пераўзыходзячымі сіламі, падтрымліваючы сваю пяхоту з паветра і танкамі, праціўнік пачаў цясніць нашы падраздзяленні. Здавалася, нішто не можа, спыніць азвярэлых гітлераўцаў.

– Ні кроку назад! – крыкнуў Мельнікаў і апынуўся каля адной з гармат, дапамагаючы байцам выкаціць яе на выгадную пазіцыю. Акопы батарэйцаў засыпала зямлёй ад разрываў снарадаў, дзесьці побач застагнаў ранены. Моцная ўзрыўная хваля балюча кінула камісара на скрынку з-пад снарадаў.

– Таварыш капітан, вы ранены? – беражлівыя рукі салдат прыўзнялі Мельнікава.

– Нічога...я зараз... вядзіце бой!...

Жалезную стойкасць і храбрасць паказала ў гэты дзень батарэя Мельнікава. Кругом валяліся трупы захопнікаў, нападалёку дыміў падбіты танк, дзве самаходныя гарматы.

Летняе наступленне Савецкай Арміі закончылася ўпорнай барацьбой за Днепр. Гітлераўцы стварылі магутную паласу абароны на Дняпры, сцягнуўшы сюды значныя сілы. Яны занялі добра ўмацаваны правы гарысты бераг, узарвалі ўсе масты, знішчылі ўсе пераправачныя сродкі. Нямецкае камандаванне разлічвала надоўга затрымаць тут савецкія войскі. Яно было перакананае ў немагчымасці фарсіраваць многаводны дняпроўскі рубеж, які дасягаў месцамі 600-мятровай шырыні.

Капітан Мельнікаў быў у ліку тых, хто першы пачаў фарсіраваць раку. Ноч 26 верасня. Быццам фанары вісяць у паветры ракеты. Парывы моцнага ветру зганяюць іх у бок, але ўспыхваюць усё новыя і новыя, разрываючы цемру над самай ракой. Не заціхаюць кулямёты. То там, то сям раздаюцца выбухі гармат, і глухія разрывы снарадаў

ускалыхваюць зямлю. Час-адчасу падымаюцца фантаны вады: немцы прастрэльваюць раку. Пайшоў дождж. І вось пад прыкрыццем ночы і дажджу капітан Мельнікаў з групай разведчыкаў і сувязістаў рашыў пераправіцца на правы бераг Дняпра. Праз хвіліну лодка нырнула ў цемру. Успыхнула ракета. Прамень пражэктара лізнуў паверхню вады і знік. Наступіла трывожная цішыня. Мельнікаў з групай смельчакоў набліжаўся да берага. І раптам ажыў правы бераг. Лодку выявілі. Застракаталі кулямёты, загаварылі гарматы і мінамёты. Вада кіпела ад снарадаў і мін. Халодным душам абдавала байцоў, з усяе сілы націскалі яны на вёслы. Вось і бераг. Пакінуўшы лодку, Мельнікаў і байцы растварыліся ў начной цемры. Няветліва сустрэў іх правы бераг. Небяспека хавалася за кожным кустом, за кожным бугарком. Трэба было валодаць жалезнай воляй, бязмежнай смеласцю і чуццём разведчыка, каб выканаць баявое заданне і не трапіць у рукі ворага. Мельнікаў арганізаваў разведку агнявых сродкаў праціўніка і пачаў упраўляць агнём дывізіёна. Снарады кlaліся толькі ў цэль. Знішчаны, нарэшце, мінамётная і супрацьтанкавая батарэі ворага, узляцелі ў паветра 4 кулямётныя кропкі, сотням фашысцкіх акупантаў стаў магілай правы бераг.

Сваімі дзеяннямі капітан Мельнікаў забяспечыў пераправу праз Днепр падраздзяленням нашай пяхоты.

...Андрэй Іосіфавіч не дажыў да поўнай перамогі над гітлераўскай Германіяй. Ён загінуў смерцю храбрых у баях за свабоду і незалежнасць любімай Радзімы. Смерць Мельнікава была вялікай стратай для тых, хто яго ведаў, з кім ён ваяваў. Пералічваючы подзвігі капітана ў наступальных баях 1943 года, начальнік палітаддзела той дывізіі, у якой Мельнікаў служыў, у канцы награднога ліста напісаў: "Капітан Мельнікаў заслугоўвае вышэйшай урадавай узнагароды – звання Героя Савецкага Саюза". Такое ж заключэнне даў і Ваенны Савет арміі.

...І вось у канцылярыі калгаса "Камсамолец" вісіць грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Герой Савецкага Саюза Андрэй Мельнікаў аддаў сваё жыццё за мір і шчасце на зямлі. І такім сваім земляком ганарацца хлебаробы яго роднага калгаса.

**Іваніцкі, В. Андрэй Мельнікаў / В. Іваніцкі // Кіравец (Кіраўск). — 1959. — 24 лютага. — С. 2—3.**